# КАНТРОЛЬНЫЯ ТЭСТЫ ПА АРФАГРАФІІ

## Тэст 1

**1. Адзначце словы, у якіх напісанне выдзеленых літар абумоўлена фанетычным прынцыпам:** 1) беспадстаўна; 2) праіснаваць; 3) возера; 4) аўдыторыя; 5) біялогія.

**2. Адзначце слова(-ы), напісанне якога(-іх) не супадае з вымаўленнем:** 1) адчуванне; 2) рыбак; 3) гарадскі; 4) на дарожцы; 5) стог.

**3. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *А*:** 1) адр...с; 2) н...васелец; 3) п...ўнагалоссе; 4) гл...таць; 5) р...цэпт.

**4. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Я*:** 1) леб...дзь; 2) л...снікова; 3) ц...гавіты; 4) с...м'янін ; 5) дроб...зь.

**5. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Э*:** 1) р...сора; 2) р...форма; 3) д...лікатнасць; 4) ц...ментаваць; 5) Тр...ццякоў.

**6. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Ы*:**
1) вы...граць; 3) спад...лба; 5) за...нець.
2) з...мправізаваць; 4) дэз...нфекцыя;

**7. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *О*:**
1) сл...ватворчасць; 3) шкл...вата;
2) сп...ртбаза; 4) кр...ватачывы; 5) ф...таграфія.

**8. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) дапушчана памылка:** 1) кардыяграма; 2) іезуіт; 3) батальон; 4) грацыёзны; 5) ідэалогія.

**9. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) ёсць прыстаўная галосная:**
1) замгліць; 3) зардзецца; 5) абылгаць.
2) замшэлы; 4) пад ільдом;

**10. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца *мяккі знак*:** 1) сып...це; 2) сядз...це; 3) змен...шыць; 4) ін...екцыя; 5) выдз...муты.

рэпазіторый

**11. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *У*:**
1) нака...т; 2) ліноле...м; 3) пакга...з; 4) фа...на; 5) ма...зер.

**12. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) пішацца падвоеная зычная:**
1) маладосц...ю; 2) Мек...а; 3) Ал...а; 4) дзесяц...ю; 5) тэлеграм...а.

**13. Адзначце слова(-ы) з прыстаўным(-і) зычнымі:**
1) Лявон; 2) навучаны; 3) волат; 4) вольна; 5) шматвобразны.

**14. Адзначце слова(-ы), якое(-ія) піша(у)цца з вялікай літары:**
1) (П,п)ершая балада Шапэна;
2) (М,м)іншчына;
3) Беларускі (Д,д)зяржаўны (У,у)ніверсітэт; 4) (П,п)ершая сусветная вайна; 5) (Б,б)еларускія рэкі.

**15. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) дапушчана памылка:**
1) карыстны; 2) бухгалтар; 3) маёмастны; 4) ростань; 5) Рэмбрант.

**16. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца *апостраф*:**
1) здароў...е; 3) нап...юся; 5) кан...юнктура.
2) аб...інелы; 4) бракан...ер;

**17. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца толькі літара *С*:**
1) фарпо...ны; 3) у дзе...цы; 5) ...чэпленыя (вагоны).
2) ра...шчапіць (палена); 4) мые...ся;

**18. Адзначце слова(-ы) з правільным напісаннем:** 1) гвардыя; 2) чарствець; 3) лідэр; 4) Атлантыда; 5) каранцін.

**19. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) дапушчана памылка:** 1) наорваць; 2) обыск; 3) вохкаць; 4) окаць; 5) навогул.

**20. Адзначце слова(-ы), якое(-ія) правільна падзелена(-ы) на часткі для пераносу:** 1) бяз-мерна; 2) бе-зумоўна; 3) ра-сплесці; 4) вад-зіца; 5) су-дзя.

**Тэст 2**

Рэпазіторый

**1. Адзначце словы, у якіх напісанне выдзеленых літар абумоўлена традыцыйным прынцыпам:** 1) экзамен; 2) просьба; 3) лясы; 4) месяц; 5) мелодыя.

**2. Адзначце, якія змены зычных гукаў перадаюцца на пісьме:**

1) шыпячых у сярэдзіне слова перад свісцячымі;

2) глухіх у сярэдзіне слова перад звонкімі;

3) прыставак *без-, раз-, з-*;

4) прыстаўкі *аб-*;

5) каранёвых *з, ш, ж, г, х* у геаграфічных назвах.

**3. Адзначце слова (-ы), напісанне якога(-іх) не супадае з вымаўленнем:** 1) лісяня; 2) адступаць; 3) зжаць; 4) абрыкос; 5) барацьба.

**4. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Э*:** 1) ц...рымонія; 2) нав…ла; 3) ж...тон; 4) р...монт; 5) карц...р.

**5. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Е*:** 1) бал...рына; 2) кол...р; 3) сённ...шні; 4) п...сняры ; 5) бо...зь.

**6. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) на месцы пропуску пішацца літара *А*:** 1) кр...пасны; 2) гл...таць; 3) с...кратар; 4) р...корд; 5) р...сора.

**7. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Ы*:**

1) контр...гра; 3) між...нстытуцкі; 5) пра...снаваць.

2) спад...лба; 4) без...дэйны;

**8. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) дапушчана памылка:** 1) фіалка; 2)ідэялізацыя; 3) маянэз; 4) фае; 5) бульён.

**9. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Ў*:**

1) стра...с; 3) хвалі ...льтрагукавыя ; 5) радасна-...знёслы.

2) а...кцыён; 4) аквары...м;

**10. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) на месцы пропуску пішацца літара *О*:**

1) к...лаўрот; 3) д...бразычлівы; 5) кін…пракат.

РЕПОЗИТОРИЙ

2) н...вамодны; 4) х...разнаўства;

**11. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) дапушчана памылка:** 1) шэравокі; 2) вокаць; 3) войкаць; 4) паімкнуцца; 5) одбліск.

**12. Адзначце слова(-ы) з памылковым напісаннем зычных:** 1) шчарсцвець; 2) усчынаць; 3) усчаміць; 4) фудбол; 5) нішчымны.

**13. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) на месцы пропуску пішацца *мяккі знак*:**
1) дз...ме; 2) дроб...; 3) смаргон...скі; 4) кін...це; 5) дз...веры.

**14. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца *апостраф*:**
1) л...ецца; 3) Лук…янаў; 5) разнатраў...е.
2) Сібір…ю; 4) парц…еры;

**15. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Ц*:** 1) узбе...кі; 2) лю...скі; 3) слава...кі; 4) беласто...кі; 5) тка...кі.

**16. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) дапушчана памылка:**
1) упэўненасцю; 2) каллегія; 3) соллю; 4) пераллю; 5) Жана.

**17. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) дапушчана памылка:** 1) подвіг; 2) дызель; 3) аванцюра; 4) Індзія; 5) дыскатэка.

**18. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *А*:**
1) в...льнадумец; 3) сл...ваформа; 5) кін...ўстаноўка.
2) ш...равокі; 4 )зак…назнаўства;

**19. Адзначце слова (-ы), якое (-ія) піша(-у)цца з *вялікай літары*:**
1) (К,к)оласаўскі стыль; 4) (Д,д)ом літаратара; 2) (С,с)таўбцоўшчына; 5) (М,м)іністр адукацыі.
3) (Н,н)арачанскія краявіды;

**20. Адзначце слова(-ы), якое(-ія) правільна падзелена(-ы) на часткі для пераносу:**
1) пераў-зышоў; 3) нас-кочыць; 5) паралела-грам.

репозиторий

2) выдаве-цтва; 4) высакаро-дны;

## Тэст 3

**1. Адзначце словы, у якіх напісанне выдзеленых літар абумоўлена фанетычным прынцыпам:** 1) нясві**ж**скі; 2) а**б**хапіць;3) Слу**чч**ына; 4) гора**д**; 5) ра**с**ол.

**2. Адзначце, якія правілы заснаваны на марфалагічным прынцыпе:**

1) правапіс *і, ы, й*;
2) правапіс суфікса -*ск*- у прыметніках, утвораных ад геаграфічных назваў і назваў нацыянальнасцей;
3) напісанне *у* (складовага) пасля галосных у пачатку ўласных назваў; 4) правапіс прыстаўкі *над*-; 5) правапіс прыназоўніка *без*.

**3. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Э*:**
1) мар…ва; 2) турн…; 3) рэзюм…; 4) др…вотня; 5) д…зерцір.

**4. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Е*:**
1) высв…тліць; 2) В…часлаў; 3) по…зд; 4) л…скатанне; 5) в…сляр.

**5. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) дапушчана памылка:**
1) патрыятызм; 2) арыянтацыя; 3) Емен; 4) пантэон; 5) Іянічнае мора.

**6. Адзначце няправільнае напісанне слоў:**
1) абынтэлігенціцца; 3) паімправізаваць; 5) няінакш.
2) спадзілба; 4) звышідэйны;

**7. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *У*:**
1) кло…н; 3) па-…краінску; 5) вучоны-…нікум.
2) жывёлы …ючныя; 4) фра…;

**8. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца прыстаўная літара:**
1) …охаць; 3) …азёрны; 5) у…огуле.
2) на …мху; 4) па…мкнуцца;

РЕПОЗИТОРИЙ

**9. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *А*:**
1) м…тагонкі; 3) в…даўстойлівы; 5) мал…чнакіслы.
2) зак…назнаўства; 4) кар…ткахвалевы;

**10. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) пры перакладзе з рускай мовы на беларускую будзе пісацца падоўжаны зычны:** 1) Одесса; 2) мадонна; 3) судья; 4) авторалли; 5) гамма.

**11. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *У*:**
1) ска...т; 3) са...на; 5) «Песняры» ...схвалявалі нас.
2) жанчына-...рач; 4) вельмі ...нікальны;

**12. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *І*:**
1) спад...лба; 3) па...мправізаваць; 5) пера...начыць.
2) вы...грываць; 4) з...мшэць ;

**13. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) дапушчана памылка:** 1) сцімул; 2) дзізайн; 3) валакардзін; 4) ятвягі; 5) Ціраспаль.

**14. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца *мяккі знак*:** 1) разал…ю; 2) насып…це; 3) цвіс…ці; 4) тайван…скі; 5) пяц…сот.

**15. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца *апостраф*:** 1) шампін…ён; 2) зал…ю; 3) бул…ён; 4) раз…язны; 5) Салаў…ёў.

**16. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) пры ўтварэнні прыметніка спалучэнні зычных, што ўзнікаюць на стыку кораня і суфікса *-ск-*, перадаюцца праз *ц*:** 1) узбек; 2) калмык; 3) ткач; 4) Брэст; 5) людзі.

**17. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца толькі літара *С*:**
1) сві...нуць; 2) по...ны; 3) кантэк...ны; 4) на до...цы; 5) бала...ны.

**18. Адзначце слова(-ы), якое(-ія) піша(-у)цца з *вялікай літары*:**
1) медаль “Залатая (З,з)орка”;

репозиторий

2) (Дз,дз)ень адкрытых дзвярэй;
3) Дзяржаўная (Т,т)раццякоўская галерэя; 4) (Ш,ш)остая сімфонія Чайкоўскага; 5) (К,к)упалаўская аўдыторыя.

**19. Адзначце, што пішацца з вялікай літары:**
1) прыметнікі, утвораныя ад індывідуальных назваў людзей, калі яны ўказваюць на прыналежнасць;
2) прозвішчы і імёны, якія ўжываюцца ў значэнні агульных назоўнікаў;
3) родавыя назвы міфалагічных істот; 4) лічэбнікі пры ўласных імёнах; 5) назвы парод жывёл.

**20. Адзначце слова(-ы), якое(-ія) правільна падзелена(-ы) на часткі для пераносу:**
1) зап-лесці; 3) на-дрэзаць; 5) тавары-ства.
2) бе-зупынку; 4) па-дыход;

## Тэст 4

**1. Адзначце, які прынцып патрабуе аднастайнай перадачы на пісьме марфем незалежна ад іх вымаўлення:**
1) фанетычны; 3) марфалагічны; 5) традыцыйны.
2) дыферэнцыйны; 4) граматычны;

**2. Адзначце слова(-ы), напісанне якога(-іх) не супадае з вымаўленнем:** 1) палац; 2) печка; 3) на дарожцы; 4) лётчык; 5) цэгла.

**3. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *А*:**
1) др...васек; 3) майст...р; 5) ч...рнавалосы.
2) з...латакудры; 4) шніц...ль;

**4. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Я*:**
1) ц...гавіты; 2) выдз...ліць; 3) в...люр; 4) м...дзведзяня; 5) кам...каваты.

РЕПОЗИТОРИЙ

**5. Адзначце слова( ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Э*:**
1) барт...р; 2) выкр...сліць; 3) канц...лярыя; 4) ас...нсаваць; 5) інц...дэнт.

**6. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Е*:**
1) в...лічэзны; 3) ц...жкавата; 5) высв....тліць.
2) с...кунда; 4) шын...лём;

**7. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Ы*:**
1) суб...нспектар; 3) за...нтрыгаваць ; 5) аб...мшэлы.
2) без...менны; 4) борт...нжынер;

**8. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *О*:**
1) шкл...завод; 3) кар...ткахвалевы; 5) с...нцапёк.
2) зерн...сушылка; 4) сл...ваформа;

**9. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) дапушчана памылка:**
1) геалагічны; 3) іанасфера; 5) фіалка.
2) бактэрыолаг; 4) біастанцыя;

**10. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) ёсць прыстаўная галосная:** 1) лён ірваць; 2) зальсніцца; 3) іграць; 4) аржаны; 5) салгаць.

**11. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца *мяккі знак*:** 1) чац...вер; 2) дз...ве; 3) п...яўка; 4) ц...мяны; 5) кан...ён.

**12. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *У*:**
1) меды...м; 3) пасадачна-...злётны; 5) па...за.
2) фіна-...горскі; 4) натары...с;

**13. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) пішацца падвоеная зычная:** 1) суд...я; 2) ал...егорыя; 3) Мек...а; 4) ім...унітэт; 5) Іл...іч.

**14. Адзначце слова(-ы) з прыстаўным(-і) зычным(-і):**
1) вугал; 2) бязводны; 3) наводдаль; 4) адгэтуль; 5) вуаль.

РЕПОЗИТОРИЙ

-

**15. Адзначце слова(-ы), якое(-ія) піша(-у)цца з вялікай літары:**

1) (Г,г)анаровы грамадзянін; 4) эпоха (А,а)драджэння; 2) (Р,р)эктар універсітэта; 5) (П,п)анчанкавы творы.
3) (Е,е)ўрапейскія краіны;

**16. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) дапушчана памылка:**

1) расольнік; 3) выяздны; 5) двухмесны.
2) баласны; 4) ландшафт;

**17. Адзначце слова(-ы), якое(-ія) пішуцца з *малой літары*:**

1) (Д,д)апятроўская эпоха; 4) (З,з)аслужаны артыст; 2) (К,к)анстытуцыя Рэспублікі Беларусь; 5) Акадэмія (Н,н)авук Беларусі.
3) (Г,г)енеральны пракурор Рэспублікі Беларусь;

**18. Адзначце слова(-ы), якое(-ія) правільна падзелена(-ы) на часткі для пераносу:**

1) адз-вінець; 2) вад-зіць; 3) бія-графія; 4) двух’я-русны; 5) сяст-ра

**19. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца *апостраф*:** 1) недал…ю; 2) сен…ёр; 3) п..яніца; 4) раз…ехацца; 5) паштал…ён.

**20. Адзначце слова(-ы), якое(-ія) пішуцца з *вялікай літары*:**

1) аўтамабіль “(О,о)пель”; 4) (Л,л)еднiковы перыяд;
2) (Д,д)экларацыя правоў чалавека; 5) (К,к)райняя Поўнач.
3) (Б,б)еларускі друк;

**Тэст 5**

**1. Адзначце словы, у якіх напісанне выдзеленых літар абумоўлена марфалагічным прынцыпам:**

1) дэз**і**нфармацыя ; 3) р**о**знакаляровы ; 5) с**е**мнаццаць.
2) **с**палохаць; 4) ра**с**чоска;

**2. Адзначце слова(-ы), напісанне якога(-іх) не супадае з вымаўленнем:** 1) клёцкі; 2) нясвіжскі; 3) абутнік; 4) канверт; 5) снег.

Рэпазіторый

**3. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Е*:** 1) ары...нтацыя; 3) з...ленаваты; 5) с...ржант.
2) н...значны; 4) б...змежны; **4. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара Э:** 1) ш...дэўр; 2) кр...мянёвы; 3) шын...ль; 4) камп'ют...р; 5) ч...чэнец.

**5. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Я*:**
1) м...ккаваты; 2) с...местр; 3) л...генда; 4) се...лка; 5) сп...вакі.

**6. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) на месцы пропуску пішацца літара *А*:**
1) р...цэпт; 2) ч...рпак; 3) ш...рсцяны; 4) поч...рк; 5) камп'ют...р.

**7. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Ы*:**
1)аб...ржавелы; 3) пед...нстытут; 5) дэз...нфекцыя.
2) контр...дэя; 4) аб...сці;
**8. Адзначце слова ( ы), у якім (-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Ў*:**
1) рады...с; 3) класна-...рочны; 5) тры...мфальны.
2) індывіду..м; 4) га...біца;

**9. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) на месцы пропуску пішацца літара *О*:**
1) мал...чнакіслы; 3) в...сьмігадовы; 5) мн...галюдны.
2) мн...гагалоссе; 4) н...вабранскі;

**10. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *У*:**
1) па-...дарнаму; 3) нака...т; 5) Брэсцкая ...нія.
2) крычалі «...ра»; 4) со...с;

**11. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) на месцы пропуску пішацца *мяккі знак*:** 1) казан...скі; 2) мен...ш; 3) бол...ш; 4) лес...віца; 5) дзядз...кі.

**12. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Ц*:** 1) таджы...кі; 2) уша...кі; 3) кана...кі; 4) лі...кі; 5) паляшу...кі.

**13. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) дапушчана памылка:** 1) канвейер; 2) майор; 3) акеан; 4) радыё; 5) ёд.

**14. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) дапушчана памылка:**
1) суддзя; 2) калонна; 3) бассейн; 4) класік; 5) артыллерыя.

рэпазіторый

-

**15. Адзначце слова (-ы), якое (-ія) піша(-у)цца з *вялікай літары*:**
1) (Б,б)арадулінскія вершы; 3) (Х,х)лестаковы; 5) (Н,н)обелеўская прэмія.
2) (М,м)інскія вуліцы; 4) (В,в)асілініна сукенка;

**16. Адзначце, калі захоўваецца ненаціскное *о*:**
1) у некаторых выклічніках;
2) у канцы іншамоўных слоў пасля галосных;
3) у пачатку іншамоўных слоў;
4) у сярэдзіне слова пасля цвёрдых і зацвярдзелых; 5) на канцы слова пасля цвёрдых і зацвярдзелых.

**17. Адзначце слова (-ы), у якім (-іх) дапушчана памылка:** 1) чарствець; 2) апцека; 3) студэнт; 4) індзеец; 5) арціст.

**18. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца *апостраф*:** 1) двух…моўе; 2) ін…екцыя; 3) Мал…ер; 4) канферанс…е; 5) бракан…ер.

**19. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) пішацца прыстаўная галосная:**
1) за…ржавець; 3) урачыстая.…мша; 5) на.…мгненне.
2) на.…льняным палатне; 4) па…мкнуць;

**20. Адзначце правільнае напісанне слова(-ў):** 1) усчуваць; 2) церазпалосіца; 3) зжаваць; 4) без шапкі; 5) вуская сцежка.

## Тэст 6

**1. Адзначце, які прынцып патрабуе пры перадачы гукаў на пісьме кіравацца літаратурным вымаўленнем:**
1) традыцыйны; 3) граматычны; 5) дыферэнцыйны.
2) фанетычны; 4) марфалагічны;

**2. Адзначце, якія правілы заснаваны на фанетычным прынцыпе:**
1) правапіс *у*-*ў*;
2) правапіс прыстаўных галосных;
3) правапіс часціцы *не*;

Репозиторий

4) правапіс спалучэнняў галосных у пазычаных словах; 5) напісанне *о* на канцы іншамоўных слоў пасля галоснага.

**3. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Э*:**
1) лід…р; 3) палан…з; 5) шымпанз…
2) лат…рэя; 4) мец…нат;

**4. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Я*:**
1) м…дзведзяня; 3) запам…таваць; 5) м…цяжу.
2) кле…вар; 4) выс…яць;

**5. Адзначце няправільнае напісанне слоў:**
1) паіменна; 3) падіспытны; 5) наймацца.
2) безыдэйны; 4) паімчацца;

**6. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *І*:**
1) па...менна; 3) пера...начыць; 5) з...начыць.
2) пра...снаваць; 4) за...нтрыгаваць ;

**7. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Ў*:**
1) ва …нісон; 3) га…птвахта; 5) Ба…тыка.
2) пакга…зны 4) джо…ль;

**8. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца прыстаўная літара:**
1) …окаць; 3) на…одшыбе; 5) вока…мгненне. 2) служу …мшу; 4) за…ушніцы;

**9. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *Е*:**
1) в…лікадушнасць; 3) м…дазбор; 5) вугл…возны.
2) л…гкаатлетычны; 4) в…лікаўзроставы;

**10. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) пры перакладзе з рускай мовы на беларускую будзе пісацца падоўжаны зычны:** 1) Илья; 2) аллергия; 3) келья; 4) эпиграмма; 5) печью.

**11. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца літара *А*:**
1)пр...цілеглы; 3) з...латакудры; 5) святл...вымяральнік.
2) в...семсот; 4) сп...ртбаза;

Рэпазіторый

-

**12. Адзначце слова(-ы) з памылковым напісаннем зычных:** 1) чэхскі; 2) вагзал; 3) ушчэнт; 4) усчуваць; 5) прышчапіць.

**13. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) на месцы пропуску пішацца *мяккі знак*:**
1) дз…мухавец; 3) свержан…скі; 5) знес…ці.
2) яблын…ка; 4) соцен…;

**14. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) пры ўтварэнні прыметніка спалучэнні зычных, што ўзнікаюць на стыку кораня і суфікса *-ск-*, перадаюцца праз *ц*:**
1) Ждановічы; 2) сусед; 3) Беласток; 4) таджык; 5) славак.

**15. Адзначце слова(-ы), якое(-ія) піша(-у)цца з *малой літары*:** 1) (М,м)інскі мэр; 4) Міжнародны (К,к)амітэт славістаў; 2) ордэн Дружбы (Н,н)ародаў; 5) (Г,г)анаровая грамата.
3) (М,м)ележаўская манера;

**16. Адзначце слова(-ы), якое(-ія) правільна падзелена(-ы) на часткі для пераносу:**
1) заводс-кі; 3) пад-земны; 5) дзея-слоў.
2) бе-заварыйны; 4) абс-мяяць;

**17. Зычны *т* не пішацца:**
1) у спалучэнні *дт* на канцы іншамоўных слоў;
2) у спалучэнні *стн*, за выключэннем прыметнікаў, утвораных пры дапамозе суфікса *-н-* ад назоўнікаў іншамоўнага паходжання з канцавым спалучэннем *ст*;
3) у спалучэнні *стл*;
4) у спалучэнні *тц*, якое ўзнікае на стыку кораня і суфікса; 5) у спалучэнні *тс*, якое ўзнікае на стыку кораня і суфікса.

**18. Адзначце правільнае напісанне слова(-ў):** 1) ідэялогія; 2) акеян; 3) іерогліф; 4) іаніт; 5) меліарацыя.

**19. Адзначце правільнае напісанне слова(-ў):**
1) подзвіг; 2) Матвей; 3) Дмітрый; 4) мадыфікацыя; 5) вецерынар.

РЕПОЗИТОРИЙ

**20. Адзначце слова(-ы), у якім(-іх) пры перакладзе з рускай мовы на беларускую будзе пісацца раздзяляльны мяккі знак:** 1) пьеса; 2) барельеф; 3) каньон; 4) Аркадьев; 5) конъюнктив.

Репозиторий